Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

4 САКАВІКА 19 4 г. № 50 (2212)

Цана нумара 5 кап.

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМА ЛКСМБ

## Інфармацыйнае паведамленне

З 28-га лютага па 1-е сакавіка адбыўся пленум ЦК КП(б)Б сумесна з начальнікамі палітаддзелаў і сакратарамі РК.

Пленум ЦК разглядзеў наступныя пытанні:

1. Пытанні пасеўнай кампаніі.
2. Пытанні соўгаснага і калгаснага будаўніцтва.
3. Аб загатоўках ільну, мяса, лесу і пастаўках зярна і бульбы.
4. Пытанні закупкі хлеба і хлебаснабжэння насельніцтва.
5. Аб жывёлагадоўлі.
6. Аб ходзе прапрацоўкі і практычным правядзенні рашэнняў XVII з'езда партыі.
7. Арганізацыйныя пытанні.

У сувязі з выбраннем т.т. ШАРАНГОВІЧА І ЛЫЧОВА на XVII з'ездзе ВКП(б) членамі Камісії партыйнага кантролю і ад'ездам іх з БССР на іншую работу, пленум ЦК зацвердзіў пастанову Бюро ЦК КП(б)Б аб аспабаненні тав. Шаранговіча ад абавязкаў другога сакратара ЦК КП(б)Б і члена Бюро ЦК і тав. ЛЫЧОВА — ад абавязкаў члена бюро ЦК КП(б)Б.

Пленум ЦК зацвердзіў пастанову Бюро ЦК аб стварэнні ў адпаведнасці з рашэннямі XVII партз'езда наступных аддзелаў ЦК КП(б)Б:

1. Сельскагаспадарчы аддзел.
2. Прамыслова-транспартны аддзел.
3. Савецка-гандлёвы аддзел.
4. Аддзел культуры і прапаганды ленінізма.
5. Аддзел кіруючых парторганаў.
6. Асобы сектар.

Пленум ЦК КП(б)Б зацвердзіў загадчыкамі:

1. Сельскагаспадарчым аддзелам — т. КАРТУКОВА.
2. Аддзелам культуры і прапаганды ленінізма — т. КОНІКА.
3. Прамыслова-транспартным аддзелам — т. ГОТФРЫДА.
4. Савецка-гандлёвым аддзелам — т. ТУРЛАЯ.
5. Аддзелам кіруючых парторганаў — т. ЗЛОТКІНА.

У адпаведнасці са статутам ВКП(б) пленум зацвердзіў пастанову Бюро ЦК КП(б)Б аб скарачэнні ліку членаў і кандыдатаў Бюро ЦК КП(б)Б.

Пленум зацвердзіў Бюро ЦК у наступным складзе:

ЧЛЕНАМІ БЮРО ЦК КП(б)Б: т.т. Гікало, Бенек, Галадзед, Закоўскі, Картукоў, Ратнек, Рыскін, Саак'ян, Смірноў, Чэрвякоў, Убарэвіч.

КАНДЫДАТАМІ :т.т. Кавальчук, Герцовіч і Горын.

Пленум зацвердзіў рашэнне бюро ЦК КП(б)Б аб назначэнні дырэктарам Інстытута гісторыі партыі тав. Поссэ, вызваліўшы ад абавязкаў дырэктара інстытута тав. Леўкова, улічыўшы нагрузку яго на асноўнай рабоце сакратаром ЦВК БССР.

Пленум прыняў пастанову Бюро ЦК КП(б)Б аб зацвярджэнні рэдактарам газеты «Звязда» тав. БРАГІНСКАГА.

Адначасова пленум пастанавіў перавесці тав. ТАМАРКІНА з кандыдатаў ЦК у члены ЦК КП(б)Б, выходзячы з вылучэння т. Тамаркіна на работу дырэктарам Вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы ў Менску.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ